№ 23 Ausgabe B.

ГОМАН

№ 23 (219). Год III. Вільня, 19 марца 1918 г. Цэна 5 фэн. (3 кап.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 18.III. Урадова. Расейскі народны камісар загранічных спраў іскровай тэлеграмай у Вену і Бэрлін паведаміў:

16 марца ўсерасейскі конгрэсс у Маскве пацьвярдзіў мірную умову між Расеей і цэнтральнымі дзержавамі, падпісаную 2-го марца у Брэст-Літоўску.

За расейскага пасла ў Бэрлін назначэн Іоффэ, бышый галава мірнай дэлегаціі.

Беларускі Народны Камітэт у Менску апавешчае гэткую адозву:

«Беларускі Народны Камітэт у Менску, як нацыональны, стаячый над партыямі, орган Беларускага Народу, дабіваючагася палітычнага, культурнага і экономічнага адраджэньня, просіць бараніць бацькаўшчыну яго ад несправядлівага і шкоднага раздзелу. Яго гісторычные і этнографіч. граніцы даходзяць на ўсходзі да Сожа, абнімаюць паўночную і сярэднюю даліну Дзьвіны, на заходзі абнімаюць далёка пераважную часць гродзенскай і віленскай губэрній разам з горадамі таго-ж імі, Беласток і Брэст-Літоўск. На поўдні граніцы яго зліваюцца з межамі губэрній гродзенскай і менскай. Мы найбольш становўча пратэстуем проці жаданьня суседніх народаў разглядаць гэтые землі, як безпанскіе. З радасьцю вітаючы дзержаўнае зблізжэньне з нашымі літоўскімі і балтыцкімі суседзямі, мы цьвёрда пратэстуем проці літоўскіх незаконных дамаганьняў Вільні і вялікую часць віленскай і гродзенскай губэрній. Гэтае пытаньне можэ быць аканчацельна развязано толькі на аснове ўзаемнай угоды. Усе прэтэнсіі палякоў на часьці гродзенскай і віленскай губэрній мы безумоўна адкідаем, як безпраўные захватные дамаганьні. Мы просім паправіць палудзенную граніцу краю з Украінай згодне с палудзеннай граніцай гродзенскай і менскай губэрній, которая 600 гадоў станавіла старую гістарычную государственую мяжу. Мы жадаем незалежнага дзержаўнага быту і бачым спаўненьне гэтага толькі апіраючыся на заходнюю культуру, і яе прэдстаўніцу — Нямецкую імперыю. Мы просім аб абарону нашых справядлівых дамаганьняў і аб прызнаньні нашых прэдстаўнікаў дзеля перэгавораў.

Раман Скірмунт
Александар Зенкевіч
Павал Алексюк.

БЭРЛІН. Зносіны між Пецярбургам і Фінляндзіей спынены, фінляндзкая граніца зачынена. Нікому выежджаць с Пецярбурга не пазваляюць. Агульнае напружэньне ў горадзі узрастае з тадзіны на гадзіну. С прычыны незвычайна цяжкага палажэньня жыхароў ждуць крывавых разрухаў. Каб змагацца з выбухам іх, тайные правакатары ладзяць дробные разрухі, каторые шыбка тушацца загадзя прыгатаванымі способамі. Газэты не даюць падробнасьцей і фактаў, дык ніхто с публікі ня ведае, якое пануе папраўдзі палажэньне. Рабункі і гвалты здараюцца кожын дзень. Усе публічные гмахі да тла зрабаны марадэрамі, с каторымі ўласьці ня маюць сілы бароцца.

ШТОКГОЛЬМ. Троцкі атрымаў з Масквы ад народных камісараў запрошэньне прыехаць 18 марца на конгрэсс дзеля справаздачы аб перэгаворах у Брэст-Літоўску.

Член першай мірнай Дэлегацыі, праф. Покроўскій, востра нападаў на немцаў. Пасьля яго прамаўлялі социал-рэволюцыонер Чэрэпанов, Радэк і пані Булко.

БЭРЛІН. Глаўная камісcія рад, як піщэ «Правда», назначыла Чычэрына на мейсцо Троцкага. Чычэрын — перaконаны анархіст.

БЭРЛІН. Брэст-Літоўскую умову, паводлуг францускіх вестак с Пецярбурга, можна лічыць фактычна зацьверджэнай.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Саюзная рада государств Нямеччыны высказала сваю згоду на мірную умову з Расеей і Фінляндзіей.

ТОКІО. Японскі прэм'ер-міністэр заявіў, што вестка аб пляне саюзьнікаў паслаць свае войскі ў Сібір — выдумана.

БЭРЛІН. Бэльгійскіе войскі пашырылі свой фронт да 40 кіл. Рэорганізація бэльгійскай арміі закончэна.

АМСТЭРДАМ. Англіцкі консул у Маскве, паводлуг Рэйтэра, загадаў усім англіцкім падданым у Маскве прыгатавацца да выезду з места ўраз-жэ.

БЭРЛІН. Ходзілі чуткі, быццым у прыпадку адрачэньня румынскага караля ад трону яго мейсцо займець князь Албанскі. „Dresdener Anzeiger" упаўнамочэн заявіць, што гэтые чуткі — выдуманы, бо князь зусім не збіраецца адрэкацца ад албанскага трону.

РЫМ. Тут сільнае ўражэньне зрабіла заява Ллёйда джоржа, што ў найбліжэйшым тыдні, а мо' і раней будуць зроблены пастановы, каторые мецімуць вялізарную вагу дзеля далейшай будучыны Брытанскай імпэрыі. Тут пануе пераконаньне, што наступіў момэнт развязкі сусьветнай вайны.

ГАМБУРГ. Швэдзкі урад зрабіў з Англіей умову аб выдачу ей 500.000 тон. параходаў, палова каторых будзе плаваць у поясе блокады. Швэдзкіе валадзельцы судзен ня годзяцца на гэту умову, але швэдзкі ўрад заявіў, што ён у патрэбе сілой прымусіць іх пакарыцца.

ДРЭЗДЭН. Курляндзкая выстаўка, каторая дагэтуль была у Штутгарці, перанесена сюды і сягоньня адкрыта. Пры гэтым прамаўлялі: начальнік упраўленьня Курлянд, ф. Госслер, і паўнамочнік Курляндзіі, барон Радэн.

Вільня, 19 марца 1918.

Толькі цяпер дайшлі да нас першые пэўные весткі аб жыцьці нашых братоў-беларусаў, каторые паўтрэця году былі ад нас аддзелены лініей ваеннага фронту.

У нашых руках нумэры беларускіх газэт, выданных у Менску. Перачытываючы іх стацьцю за стацьцёй, страніца за страніцай, бачым, як ішла тамака беларуская праца, бачым вялізарны узрост беларускай нацыональнай сьвядомасьці ў нашым народзі і ўрэшці, бачым тое, што асабліва цешыць сэрцы нашы: што як наша, так і іх палітычная работа ішла і йдзе тэй жэ дарогай, што, ня гледзячы на раздзел, палітычная мысьль і тут і там выяўлялася ў адзінакавых формах.

Гэта дае нам веру, што, злучыўшыся ўрэшці ў вадну сям'ю, беларусы супольнымі сіламі здабудуць сабе даўно жданую волю, здабудуць новы лад на сваей зямлі, каторы забаспечыць нашаму народу ясную будучыну!

Народны Сэкрэтарыат Беларусі.

Усебеларускі з'езд у Менску 18-30 сьнежня 1917 г. выбраў Беларускую Раду, каторая павінна была ўзяць уласць Беларусі ў свае рукі. Каб правесьці ў жыцьцё пастанову з'езду аб наладжэньні беларускае дзержаўнасьці, Рада утварыла Спаўніцельны Камітэт, каторы быў папоўнены прэдстаўнікамі нацыанальных меншасьцяў Беларусі: жыдоў, расейцаў, палякоў, былі таксама пакінены ў ім месцы для літвіноў, украінцаў і іншых дробных нацыональнасьцяў краю. Камітэт пасылаў сваю дэлегацію на мірные перэгаворы ў Бярэсьце, але бальшэвікі не прапусьцілі яе праз фронт. Перад прыходам немцаў Камітэт, спаўняючы волю з'езду ўзяў упраўленьне краем у свае рукі і утварыў 19 лютага ўрад (правіцельства) Беларусі, Народны Сэкрэтарыат.

Сэкрэтарыт складаецца з гэткіх асоб: 1) народным сэкрэтаром унутраных спраў Макрэеў, 2) міжнародных спраў Варонка, 3) прасьветы А. Смоліч, 4) справядлівасьці Белевіч, 5) народнай гаспадаркі Серада, 6) дарог Рэдзька, 7) грашавых спраў Белкінд, 8) апекі Бодунова, 9) вялікарускіх спраў Злобін, 10) почты і тэлеграфаў Карач, 11) землеробства Грыб, 12) упаважнены па вясковым справам Езавітоў, 13) загадчык спраў Сэкрэтарыату (ён жэ віцэ-прэзэс) Заяц.

Аб гэтым жыхары былі апавешчаны асобнай граматай. Беларуская Вайсковая Рада, распушчэная і арэштаваная бальшэвікамі пасьля ўцёку іх стала пад загад Народнага Сэкрэтарыату, і беларускае войска ачысьціла ад бальшэвікоў места і ваколіцы. Камэндантам Менска назначэны быў член Сэкрэтарыату Езавітоў. 9 лютага 1918 г. Народны Сэкрэтарыат Беларусі абвесьціў незалежнасць усяе Беларусі, значыцца ня толькі занятае немцамі, але і тае, што яшчэ пад Расеей. Усходняя граніца Беларусі пройдзе па губэрнях: Чарнігаўскай, Смаленскай і Псковскай. Места Смаленск мае належыць да Беларусі. Народны Сэкрэтарыат меў права на абвешчэньне незалежнасьці усяе Беларусі, бо ён быў выбраны з'ездам, на каторым былі прэдстаўнікі усіх губэрняў і паветаў Беларусі.

Усебеларускі з'езд

Надовічы мы дасталі пэўные весьці аб Усебеларускім З'ездзе, каторы ёсць вялікім сьветлым днём у гісторыі беларускага нацыональнага і палітычнага адраджэньня. З'езд быў ад 18—30 сьнежня летатн. году і 30 сьнежня маскоўскіе бальшэвікі яго разагналі штыхамі. На З'ездзе было прэдстаўнікаў усяе Беларусі 1167 чэл. с правам пастаноўляючага голасу і 705 чэл. с правам дарадчага голасу. Найважнейшая праца З'езду, гэта: абвешчэньне Беларускае Рэспублікі і выбар Беларускае Рады, як найвышэйшага органу Беларусі.

У загадзе, дадзеным выбранай Радзе між іншым чытаем: „Каб забхаваць народнае багацьце і забаспечыць край, Рада павінна дабіцца выва дзеньня польскага войска з Беларусі і разфармаваньня яго ў найхутчэйшы час". — Якраз як на Беларускай Конфэрэнцыі ў Вільні.

С прычын тэхнічных Рэдакція ў гэтым № ня можэ падаць, шырэйшых вестак аб Усебеларускім З'ездзе.

Палітычнае становішчэ Беларусі і яе орыэнтація.

Газэта «Вольная Беларусь», каторая адбівае пагляды і жаданьня занятай цяпер Нямеччынай часьці Беларусі, а так сама і пагляды тае часьці, што яшчэ пад Расеей, друкуе стацьці аб палітычным становішчы Беларусі і яе орыэнтаціі. Гэные стацьці выражаюць жаданьня згодные с тым, чаго хочуць беларусы раней окупованай часьці Беларусі.

3 сакавіка (марца) «Вольная Беларусь» у стацці Л-ка пад назовам «Гістарычная неухільнасць» пішэ:

«Прайшло 125 гадоў с таго часу, як Меншчына разам с прылеглымі да яе землямі, была прылучэна да Масквы. Гэта было ў 1793 годзі.

21-го (8) лютага нямецкая армія увайшла у горад Мэнск, — у гэтае запраўднае сэрцэ Беларусі, заняла Меншчыну і тым палажыла канец маскоўскаму панаваньню.

За увесь час маскоўскае улады, многапакутная старонка наша не бачыла сьветлага дня, ні гадзіны. Маскоўскі урад лучыў нас не брацкім едначьнем і воляй, а нацыянальным гнібеньнем, гвалтам і няволяй. Ен не лічыўся з нашай нацыянальнай самабытнасьцю і паняверай нашай гістарычнай прошласьцю. С пачатку ён глядзеў на нас, як на палякоў, а далей залучыў да свайго вялікарускага народу і груба душыў усе зачаткі нацыянальнай сьвядомасьці і развіцьця нацыянальных сіл. Нацыянальнае гнібеньне і азіяцкая палітыка абмаскаліваньня шырокай хваляю разьліліся па нашаму краю. Край напоўніўся спэцыяльнымі чыноўнікамі абрусіцелямі; была хітра выкарыстана рэлігійная розніца і полёнізацыя шляхоцкіх станаў; сэмінарыі, гімназіі ні жэйшые школы, — усё было скіровано на тое, каб задушыць у народзе усё роднае, беларускае і павярнуць на маскоўскі лад.

Лепшые і сьвятлейшые людзі, вышаўшые з народу, бачылі гэты страшны гвалт і падашуканства і, шукаючы ратунку, думалі, што у нашым нацыянальным прыгнібеньню вінават не народ вялікарускі, а яго азіяцкі ўрад. І падаўшы братэрскую руку вялікарускай інтэлігэнцыі, яны адважна рынуліся на бой с праклятым царызмам, цьвёрда веручы, што разам с палітычнай воляй, знойдуць сабе і нацыянальны ратунак. Гадалося, што тагды народ наш без перашкоды стане на роўную нагу с сваім большым па ліку братам, вялікарусам.

Але цяжка зьняверыліся...

Рэвалюція парвала кайданы палітычнай няволі. Здавалося, што народы Расіі сталі на перададні новага соцыяльнага жыцьця і нацыянальнага росквіту. Здавалося, што ужо нічога не перашкаджае злучыцца народам Расіі ў адну згодную таварыскую сям'ю. Тым часам, пры сьвеці палітычнай волі, выявілося, што вялікарускі народ устаў перад намі, як новы валадар і гвалтоўнік. Зваліўшы самадзержавіе, ён праз сваіх міністраў-соцыялістаў рашуча заявіў, што ні адкажацца ад свайго нацыянальнага панаваньня. Карыстаючы з народнае цемнаты, павадыры маскоўскай дэмакрацыі, згуртованые ў рады работніцкіх, селянскіх і салдацкіх дэпутатаў, дзеля лягчэйшага утрыманьня свайго ўладарства, абазвалі нацыянальны рух буржуазным і контррэвалюцыйным і сталі крывёй і жалезам бараніць сваё панаваньне. Так была задушана Украіна, разагнаны першы Усебеларускі З'езд і зьнішчаны ўсе цэнтральные беларускіе арганізацыі. Батый пашкадаваў хараства слаўнага Кіева, але ні зьлітавалася над ім рука некультурнай маскоўскай дэмакрацыі. Наемные банды большэвізма ні спыніліся ні перад чым, каб утрымаць сваё нацыальнае ўладарства...

Так быў пэложэн канец брацкаму едканьню славянскіх народаў Расіі. Але паспаліты, просты народ яшчэ доўга верыў-бы ў братэрскае пачуцьце вялікарускай дэмакрацыі, каб яна сваімі самабытна - маскоўскімі соцыяльнымі ўчынкамі не апаганіла ўсіх дэмакратычных прынцыпаў. А безладзьзе, голад і агульная разруха дэрэсьцілі апошнюю кроплю надзеі...

І вось столося, што сталося. Пры утвореным палажэньню, народ моўчкі а пакорна, с патаемнай надзеяй на ратунак іншага гатунку, стрэў акупацыю роднага краю праз нямецкае войска. «Была без радасьці любоў, разлука стала без печалі»...

І гэты ратунак іншага гатунку устаў перад намі на увесь свой рост, ва ўсім яго гістарачным значэньню.

Цэнтр старой арыентацыі адсунуўся у гістарычную прошласць. Раптам ні стала і разбілася магчымасць на фэдэратыўны зьвязак пры старым палітычным цэнтры. Зьніклі надзеі на далёка сягаючые соцыальные перамены пры старой разьбітай арыентацыі. Засталося адно, — моцнае і ніпарушнае, як само жыцьцё і яго сьветлая будучына. *Гэта — дзержаўная нізалежнасць нашае многапакутнае бацькаўшчыны Беларусі.* Тут і толькі тут наш ратунак ад нацыяльнаго, палітычнаго і соцыальнаго палону.

Захаваньне цэлакупнасьці і нацыанальнае самабытнасьці нашага народу, развіцьце яго экономічнага дабрабыту і грамадзянскага ладу, — павінны стаць першымі заданьнямі у нашай палітычнай чыннасьці і далейшай будзеннай працы...»

А 8 сакавіка у стацьці „Мір і Беларусь“ „Вольная Беларусь“ піша: „С кім нам быць — з Заходам ці з Азіей — гэтае пытаньне павінно быць вырэшэно без ваганьня. Зьвязак с спустошэнай і адсунутай ад мора Вялікарасіей пагражае нам эканамічным, грамадзянскім і нацыанальным занепадам і не забезпечае нас ад новае ваеннае патолі, бо трудна спадзявацца, каб акрыяўшая Масква не пажадала сабе рэваншу.

Беларусы павінны дабіцца прэдстаўніцтва на агульна эўропейскім міравым конгрэсі“.

Другіе беларускіе газэты, што выходзяць на ўсходзе Беларусі, напр. „Беларускі Шлях“, пішуць у гэткім жэ кірунку.

Беларускіе газэты ў Менску Беларускім.

„Вольная Беларусь“ — тыднёвік палітычны і літэратурны, выходзіць рускімі літэрамі. Выдае „Т-ва Беларускай Культуры“. Рэдактар І. Лёсік. Паміж пастаяннымі супрацаўнікамі ёсць Алесь Гарун (Прушынскі) і Зьмітра Бядуля (Плаўнік).

Цэна на год 12 р., на паўгода 7 р., на 1 мес. 1 р. 50 к. Адрэс рэдакціі і адміністрації: Менск Беларускі, Захараўская 18.

„Беларускі Шлях“ выходзіць рускімі літэрамі, мае стаць органам утворэнага ў Менску „Менскага Беларускага Прэдстаўніцтва“. Рэдактар - выдавец П. Аляксюк. Як пачне хадзіць почта, газэта будзе штодзеннай. Супрацаўнікамі газэты ёсць: Зьмітра Бядуля, Язэп Варонка, Алесь Гарун, Язэп Лёсік, Віктук Чаўсоў, Александэр Уласоў, Ромуальд Земкевіч і інш.

Адрэс рэдакціі і канторы: Менск Беларускі, Серпухоўская вул. № 12.

Мэтай абедзьвых газэт ёсць незалежнасць Беларусі, нацыанальная арганізація, разьвіцьце беларускай духоўнай і матэр'яльнай культуры. У абедзьвых газэтах працуюць старые робачаі на беларускай ніве.

„Беларуская Рада“ — орган Спаўняльнага Камітэту Беларускай Цэнтральнай Вайсковай Рады. Газэта ваенна-палітычная, грамадзкая і літэратурная, выходзіць па беларуску і па расейску тройчы ў тыдзень. Палітычные пагляды „Беларускае Рады“ не зусім згаджаюцца с паглядамі „Вольнае Беларусі“ і „Беларускага Шляху“; гэта пэўня дзеля таго, што мы маем № „Б. Р.“ с 5 лютага 1918 г., як Меньчына была яшчэ пад Расеей.

Ці „Б. Р.“ цяпер выходзіць? Адрэс рэдакціі: Менск Беларускі, Паліцэйская 2.

Усе гэтые тры газэты выходзюць у шчыра беларускім духу, і у нас німа слоў выказаць радасьць с прычыны іх! Нехай беларусы Меншчыны, Магілёўшчыны і Вітэбшчыны, каторых жаданьня выказываюць гэтые газэты, ведаюць, што іх жаданьня ёсць нашымі жаданьнямі, што нашы сэрцы б'юцца аднальково.

Аб „Бѣлорусской земли“, што выходзіць па расейску, мы пакуль што нічога ня можэм сказаць.

«Krynica» — тыднёвая газэта, друкуецца лацінскімі літэрамі. Рэдактар выдавец кс. Хвецько. Назначаецца бытцым для „беларусаў-каталікоў“. Бяром яе ў рукі з радасьцю, бо гэткае выданьне для беларусаў — каталікоў вельмі патрэбно. Аднак скора разчаровываемся. У туманных стацьцях і заметках „Krynicy“ зусім німа беларускай палітычнай ідэі. Газэта робіць уражэньне небеларускай. Яна стаіць на фальшывым грунце. Хай нам даруюць выдаўцы яе, дай Божэ, каб мы абмыліліся: мы пэўны, што яна не адбівае пагляду беларускага каталіцкага духавенства. Нам здаецца, што «Krynica» прыняла-б шчыра беларускі палітычны кірунак, каб яе рэдакція падзялілася паглядамі з беларускім каталіцкім духавенствам раней занятатай немцамі часьці Беларусі, хоць с прычыны ненармальных варункаў гэта вельмі цяжка.

Канчаючы гэтых некалькі радкоў мы жадаем нашым братом шчасьця ў агульнай нам ідэйнай працы дзеля адраджэньня і незалежнасьці беларускага народу. Стоючы разам на грунце незалежнасьці мы будзем глядзець, каб суседзі нашы нас не пакрыўдзілі, аса бліва цяпер гэта адносіцца да палякоў, бо пажаўзьлівые рукі польскае прагавітасьці выцягіваюцца, каб захапіць шчыра беларускіе землі, як Беласточчыну і інш. Але якбы польская эндэція не ўбірала свайго ярма, завучы не прылучэньнем Беларусі да Польшчы, але злучэньнем, фэдэрацией, уніей (бо адно ліха!), нават тэк бязбога баламучэны дагэтуль імі беластоцкі беларус - каталік, пачынае разумець, што гэта адна і таяж польская няволя, ў рознай вопратцы.

У культурнай справе найбаржджэй трэ было-б заняцца арганізаціей беларускіх школ. Як га трэба арганізаваць у Менску беларускіе вучыцельскіе курсы. Кніжкі для пачатковых школ можна дастаць з Вільні Можэ быць трэба было-б надрукаваць іх рускімі літэрамі.

„Нямецка-польская програма угоды“.

Пад такім загалоўкам памешчае „Berliner Tagbl.“ (№ 132 с 13.III. 18) справаздачу аб перэгаворах, якіе апошнімі днямі адбываліся ў Бэрліне між палякамі і кіраўнікамі партый, перэважываючых у нямецкім парлямэнці.

„Польска-нямецкіе контрасты, каторые ўсё больш завострываюцца ў Польскім каралеўстве, выклікаюць з абодвых бакоў жаданьне знайсьці аснову дзеля трывалай угоды, каторая здаволіла-бы патрэбы абедзьвых старон. З гэтай мэтай польскіе актывістычные партыі — пэўне з ведама рэгенцкай рады — шукалі і завязалі зносіны з перэважываючымі ў Рэйхстагу нямецкімі партыямі. Польскіе паўнамочнікі пазаўчора адбылі нараду з некаторымі членамі парлямэнту, у тым ліку з Наўманам і ф. Рэйхэнбэр'гам, і уложэные на пісьме іх праекты былі ўчора разгледжэны на агульным заседаньні большасьці Рэйхстагу. Рэзультат гэтых перэгавораў болей-меней такі: Польская дзержава прызнае на заходзі тые граніцы, якіе былі перад вайной, і гатова бліжэй разглядзець пытаньне аб прылучэньні Польшчы да саюза цэнтральных дзержаў. За гэта партыі вялікшасьці Рэйхстагу — таксама пэўне са згодай ураду — абецуюцца бараніць Польшчу ад усякай анэксіі, якой дамагаюцца ўсенемцы, асабліваж аднесьціся сур'ёзна да польскіх пратэстаў у Холмскай справе. У будучыне Польшчы мае быць дадзена магчымасць на аснове права на самаазначэньне пашырыцца на ўсход — коштам заходняй Расеі, напрыклад, на Меншчыну, дзе ёсць вялікіе польскіе інтэрэсы, каб гэтак утварыўся для Польшчы шырокі калідор да Расеі — між Літвой і Украінай. Далей, згодне з жаданьнем вялікшасьці Рэйхстагу, Польскай дзержаве будзе дадзена помач у магчыма хутчэйшым наладжэньні гасударстве-

Максім Гарэцкі.

АНТОН.

(Абразы жыцьця).

(Гл. «Гоман» № 22).

Упёк, упёк... У сваёй хатцы. Матка кашулю яго вашывую ў печ у агонь кідаіць, цёплаю летнаю вядзіцаю цыпкі на ножках абмываіць, сінячкі яго гладзіць, ручкі ад сіверкі пашчэпаные аліваю масьліць, за шыйку абшчапіла, жалеіць...

А дзед пугу падняў, — вісока-вісока замахнуўся-намерыўся... Не дам! Не дам Іваньу біць!

А Йванька ляжыць, уміраіць, лобік беленькі ад мукі-болі у складачкі моршчыць, сьлязу роніць...

Заб'ю бацьку за Йваньку!

Узьдзяюць зялезы на рукі, на ногі, вязуць у Сібір далёкую, у катаргу векавечную... Прыкуюць таамацька к камню пад зямлёю і аж да самае сьмерці на сьвет ня пусьцюць... Не ўбачу я болі ні бацькі... (ах, бацьку пахавалі...) ні Домны, ні дзетак! ні свае хаткі, ні свайго коніка, ні свайго сабачку, ні ўбачу ніколі, ні разу, ні разу...

А сямейку маю будуць зневажаць без мяне, сібірнікам зваць...

А Домна заліваіцца-плачыць, горка плачыць, як тады, калі на дзежу-садзілі, касу расплеталі, пад вянец рыхтувалі і выпраўлялі...

Цалаваўся з Домнай... Салодка, крэпка-крэпка, на ўсю сілу... Сорамна... прад Богам...

Едуць к вянцу... Антон! Антон! — Хто там завець? — Поп цябе гукаіць Праспаведаць трэба цябе, кажуць, што к штундыстам за Дрыбін езьдзіў ты... — Бацюшка, бацюшка! Я Домну бяру за сябе? — А на што бацьку набіў? Ня будзіш даўгалетні, бо крыўдзіш бацьку, не шануіш, абразіш!.. — Бацюшка, бацюшка! — Ах ты, ах ты, дэмакрат ты, у вайстрог цябе забраць, на цэлу ноч п'яным стражнікам на зьдзек аддаць, як Дудзячонка з Несьцерава... Ніхай высьпяткамі ў самы від б'юць, гваздамі с падашоў па вачох, і плююць табе, кархаюць ніхай... Каб кроў, кроў... Каб зьмясіць у гразь, у бруд... — Біце! Біце! — О-лё-лё... — Сьвісь! — Ратуйце!.. Кусі, кусі, кусі!.. Петуй яго каламі! — Ой! — Ай! Мазгі, мазгі цякуць! — Затапчы іх у пыл... — Ой, ня выйце бабулькі, не званіце званы... — Едуць, едуць на конях з бізунамі... — Не паддавайся, стой, братцы! — Што вы, што вы, то ж бацюшка с крыжам... — Бацюшка, я Домну бяру... Я хацеў ба дапытацца, вы с кніг усё ведаеце, гдзе канец сьвету? Што, каб так ішоў ды йшоў цэлы век, ці дайшоў бы ў такую мясьціну, гдзе бераг зямлі, а далей крута-крута, абрыў, земля сыпліцца, корні ў ёй, як тая гара Богумільская, а там бяздонная прорва, туман, цёмна-цёмна, цямнота спрадвечная і ўсё... А што там у тумані? А пекла гдзе? А чаму ня чутна, як там стогнуць?

Адлезьце ад мяне, дзядзька Кузьма, не дакучайце! Як гэта поп можэ ня ведаць.

нага устройства. Але трэба яшчэ перш перамагчы вялікіе перашкоды: павінны быць выпаўнены вядомые варункі, і толькі пасьля гэтага вялікшасць Рэйхстагу абяжэцца аказаць паддзержку гэтым праектам. Польская заява аб прызнаньні заходніх граніц павінна быць перароблена паводлуг жаданьня Рэйхстагу. Далей могуць узняцца яшчэ розные іншые пытаньня,—напр. аб польска-літоўскай граніцы, каторые могуць вызваць нязгодлівасць. Перш-наперш вялікшасць Рэйхстагу дзержыцца таго пагляду, што ніякая пастанова ня можэ быць прынята аканчацельна, пакуль нямецкі ўрад не абмяркуе ўсяго разам з аўстрыяцкім урадам. Перэгаворы між Бэрлінам і Венай павінны адбыцца перад разглядам гэных пытаньняў Рэйхстагам. Яшчэ вялікшасць Рэйхстагу справядліва лічыць канечне патрэбным, каб польскіе прэдлажэньня былі офіцыальна апавешчэны ў Варшаве і каб гэтым быў створэн цьвёрды грунт дзеля заняцьця пазыціі вялікшасцю Рэйхстагу».

«Быцьцё у Бэрліне генэрала-фэльдмаршалка ф. Гіндэнбурга, ведама, не мае з гэтымі перэгаворамі нічога супольнага» — канчае заметку «Berl. Tagbl.» І ў гэтай заяве трэба бачыць для нас добрую запаведзь: ня можэ быць ніякай спорні што са стараны фэльдмаршалка Гіндэнбурга трудна спадзевацца прыхільных адносін да польскіх захватных плянаў.

А пляны гэтые ўвайшлі ў новую фазу. Дагэтуль, дамагаючыся прылучэньня да Польшчы Беларускіх зямель, палякі свае воўчые апэтыты стараліся прыкрыць і прыхарошыць гутаркамі аб гістарычных правох, аб «брацтве» народаў, аб узаемнай патрэбе федэрацыі Польшчы, Беларусі і Літвы. Цяпер польскіе палітыкі адкінулі фіговы лісток: нікога не саромячыся, яны вядуць ужо адкрыты торг беларускай скурай, вырэкаючыся за кусок Беларусі спаўненьня свайго нацыональнага ідэалу у поўнай меры. Мала таго: яны ў перэгаворах з нямецкай парляменцкай большасьцю нават не ўспамінаюць і імі Беларусі, называючы наш край проста «заходняй Расеей» — «западным краем», як называлі нас раней маскалі.

Але ўжо позна замаўчываць беларусаў, што яны выступілі на сусьветную палітычную арэну, як сьвядомы сваіх патрэб і мэт, арганізованы народ. Яшчэ ўчора мы ня ведалі, што робяць нашы браты—беларусы, каторых ад нас аддзяляла гэтулькі часу лінія фронту; цяпер мы ведаем, што і там народ аб'явіў сваю волю быць незалежным, што ўжо заложэны фундамэнт пад будоўлю свайго уласнага беларускага гасударства. І мы горача пратэстуем проці торгу нашай воляй і нашай будучынай, веручы, што офіцыальнае прэдстаўніцтво Беларускага народу як у Вільні, так і ў Менску дасць належны адпор гэткай безпрыкладнай спробе польскай дзержавы ўчыніць нячуты гвалт над Беларусьсю.

І. Мялешка.

У Вільні і ваколіцах.

× **Сь. п. Ігнат Буйніцкі.** Як чытаем у № 30 «Вольнай Беларусі» з 19 лістапада 1917 г., зышоў са сьвету шчыры працаўнік па арганізаціі беларускага народнага тэатру, Ігнат Буйніцкі.

Высказываючы наш шчыры жаль с прычыны гэтай цяжкой утраты, мы ў адным з найбліжэйшых нумэроў пазнаёмім нашых чытачоў с працай сь. п. Ігната Буйніцкага у абшырнейшай стацьцці.

× **Аб пасылцы пісем.** Шмат пісем у межах Обэр Ост не даходзяць да адрэсатаў с прычыны неакуратнага спаўненьня урадовых загадаў. Вось, галоўные чатыры правілы, якіх трэба дзержацца:

1) Пісаць падробна адрэс, каму пасылаецца пісьмо, і свой уласны.
2) Пісаць пісьмы коратка, ня больш 2 страніц.
3) Ніколі не падаваць заклееных пісем.
4) Ніколі не забывацца аб патрэбе наклейкі пачтовай маркі.

× **Развядзеньне крапівы.** «Wiln. Ztg.» прызывае заняцца сёлета развядзеньнем.. крапівы, валокны каторай, як паказалі леташніе спробы вельмі цэнны матэр'ял дзеля одзежы. Расткі крапівы трэба рассаджываць у 25 цэнтымэтрах адзін ад аднаго.

× **Тэмпэратура.** Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошніе дні была (па Цэльсію):

	найвыш.	найніж.
15—16	+ 7,5°	— 6,0°
16—17	+ 6,0°	— 4,8°
17—18	+ 1,3°	— 2,6°

З выстаўкі абразоў мюнхэнскіх артыстаў у Вільні.

20 лютага ў Вільні адкрылася „веснавая" выстаўка абразоў. Гасподу ў д. № 6 пры сьв.-Юрскім праспэкці гэтак дапасавалі да назначэнай дзеля яе мэты, што атрымліваецца уражэньне бытнасьці ў тыповай выставачнай салі. Гэткая выстаўка двойчы цэнна ў часі вайны: яна дае людям магчымасць адарвацца на момэнт ад жыцьця, поўнага бед, і правясьці некалькі хвілін паміж творамі праўдзівага мастацтва. А с-паміж 236 нумэроў, паказаных у каталёгу, значная часць выстаўленых рэчэй заслужывае на гэтае імя. Ня ведаючы, што гэта — творы мюнхэнскіх артыстаў, лёгка можна пазнаць паходжэньне гэтых абразоў.

Выстаўка складаецца с колькінаццаці, плястычных твораў і вітражаў, колькіх дзесяткаў графічных, а рэшта — абразы на палатне.

Перш за ўсё с паміж графічных твораў заслужываюць на увагу некалькі сыльвэтак — жаноцкіх і дзіцячых, каторые паводлуг схопленага ў іх рытму жыцьця могуць раўнавацца с «Schattenbilder» Diefenbacha. Цікавые і некаторые іншые нумэры з гэтай групы (напр. розные момэнты с падарожы па благіх дарогах, як бытцым падгледжэные Дільлем на размокшых дарогах у Обэр Ост).

Аб захаваньні слаўных традыцій вітражовага мастацтва сьведчаць некалькі прымернікаў — абразкоў вітражовых van Treck'a „Kommet her zu mir" (паводлуг Кудэра), św Michał Arch; гэрбовые шчыты, абычаёвые сцэны са старанямецкага жыцьця; ўсё гэта адзначываецца укладам і звычайнай на вітражах сочнасьцю колераў, а, напр., у гістарычных сцэнах — акуратнасьцю рэзаных на медзі штыхаў.

Плястыка добра прэдстаўлена бюстамі і фігурамі. Рэзьба прышусіла мармар і бронзу прамаўляць такім голасам форм і так ярка, як прамаўляе сама прырода ў тыповых творах сваіх. (Напр.: Мадонна, „Шчасьце", Hauptmann Bötzow, жыдоўка з Беластоку, група сабак, ды інш.).

На **абразох** бачым мы нямецкую зямлю то гарыстую, то раўніну, і бачым мы побач з добра знаёмым відам сярэдня нямецкага места сельскі абразок, хату тырольскага горца і інш. Аднак, віды не занімаюць першага мейсца між выстаўленымі абразамі: яно прыналежыць вельмі пекным бытавым абразком артыстаў Гэрманн'а, Ісэнбург, Румпэльт, Эссэр, Рау, і інш., клясычнага хараства кветкам (арт. Дэухэрт, Кайсэр і інш.) і так званым, «Stilleben» (арт. Куппэльмайэр, Мюльлер-Вішін, Эгэрсдорфэр, Шульц і ін.) З бытавых абразкоў выяўляецца нямецкая дамавітасць, «Фамілёнсінн»; кветкі як бытцым цягнуцца да светла, абдараючы нас сваім пахам; «Stilleben» вабяць нас выглядам фруктаў, смачнай рыбай, спакоем, сьвятой цішынёй і водаром даўнага кадзідла закрыстый. («Sacristei-Stilleben»). Сільнае ўражэньне сваей імпульсыўнасьцю робіць абразок Гэссэ „Паўстаньне", а так сама „Барбара" Фолькэрт'а — мілы абраз патронкі артылеры ў стылю рококо. Знаўцы т.-зв. «актаў» знойдуць некалькі даволі добрых абразкоў гэтага роду.

Організатарам выстаўкі належыцца падзяка за уладжэньне выстаўкі, і публіка павінна скарыстаць з аказіі, каторая дай Божэ, каб здарылася часьцей.

Лічым патрэбным адзначыць, што было б лепей, каб гасподу выстаўкі не апаліваці-бы гэтак моцна — хаця-бы ўважаючы на набліжэньне васны. Шкада, што каталёг не уложэн ані паводлуг саль, ані паводлуг чатырох артыстычных груп, якіе прынімаюць учасьце ў выстаўцэ (Münchner Künstler-Genossenschaft und der Bund, Luitpoldgruppe, Künstlerbund Bayern і Secession).

В.-Р.

КУРЛЯНДЗІЯ.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 15.III. **Урадова.** Дэпутація Курляндзкай Краёвай Рады, зложэная з барона Радэна, старшыні Вэхнэка, адваката Мельвіля і генэральнага супэр-інтэндэнта Бэрнэвіча была сягоньня у канцлера і падала яму вядомую ўжо рэзолюцію Краёвай Рады з 8 марца. Канцлер, адказываючы, між іншым сказаў:

«Яго Вялічэство, Імператар, ад сэрца дзякуе за даверые, высказанае ў рэзолюціі. Яго Вялічэство загадаў мне прызнаць ад імі Нямеччыны гэрцогство Курляндзкае вольным і незалежным. Пры укладаньні яго констытуціі павінно быць праведзено народнае прэдстаўніцтво краю на шырокіх асновах. Дзеля устанаўленьня і формуліроўкі цеснага з'еднаньня з Нямеччынай, як таго жадае Краёвая Рада, будуць учынены патрэбные крокі. Формальнае прызнаньне Курляндзіі будзе послано Краёвай Радзе.

«Будучына рэшты Балтыцкіх зямель развязываецца нідаўна падпісанай нямецка - расейскай умовай».

Апрыч таго канцлер высказаў сваю радасць с прычыны аднадушнасьці нямецкага і латышскага элементу.

БЭРЛІН. Тутэйшые газэты разгледаюць апавешчэньне незалежнасьці Курляндзіі. Правые дамагаюцца прылучэньня да Курляндзіі такжэ Эстляндзіі і Ліфляндзіі.

«Deutsche Tagesztg.» апрыч таго трэбуе, каб і Літва была гэтак цесна звязана з Нямеччынай, як трэба, каб яна станавіла баспечны мост між Нямеччынай і Балтыцкімі землямі.

Свабодна-консэрватыўная «Post» гэтак сама дамагаецца «канечнага забаспечэньня ў Літве».

Левые газэты занімаюцца пытаньнем аб правох Курляндзкай Краёвай Рады.

«Vossische Ztg.» пішэ, што Рэйхстаг павінен прыняць пад увагу якіе заверэньня можэ даць Краёвая Рада, што яе жаданьня будуць пастаяннымі жаданьнямі большасьці народу. «Berliner Tagbl.» жадае праверкі паўночнасьці Краёвай Рады, ў каторай, напрыклад, німа прэдстаўнікаў работнікаў.

«Berl. Börsenztg» кажэ, што Нямеччына, далучаючы да сябе Курляндзію, прынімае на сябе вялізарны адказ, каторы выявіцца ў поўнай меры толькі пасьля вайны. Ядыны способ паменшыць немінучую небаспеку—гэта правядзеньне прынцыпа, «што мы не павін-

---

Ен усё ведаіць, толькі ня хочэ сказаць... А Бог Саваоф у Піліпа на абразу у куце, валасы і барада сівенькіе-сівенькіе, зьверху над галавою вока, страшнае такое, вялікае, а руку далоньню выставіў і пільна—грозна узіраіцца. А Ен вялікі-вялікі, расьцець-расцець, кала яго сьвет і глядзець ня можна, бліщчыць усё, бліщчыць..

(Антон дрыжыць; час ідзець; сонца павярнуло і залезло пад павець на калесы).

Вялікае—тоўстае—цяжкое нешта стала прад вачамі, ногі растуць, растуць,доўгіе-доўгіе.

(Так пачувалося нешта Антону, калі маленькі хварэў і ўжо пачаў лепшыць)

Пахніць нечым чыстым, як краскі на лагу вясною, і рэзкім... І маленькаму, даўно-даўно, пахла так... Галава трошку балела... І цяпер як-раз так... Во німа...

А поп усё глядзіць і глядзіць у самую сярэдзіну... Не міргаіць, вочы яго чырванеюць, кроўюналіваюцца... Чараўнік! Нясіце грамніцу і сьвянцоную ваду, выкапайце калючага дзеда, асінку і крапівы — жыгучкі нарвіце... Ніхто ня чуіць, німа нікога... Значыць сьвету канец... Страшны Суд, сьветапрэстаўленьня. Тужліва, тужліва... Так нудна, ай як нудна, сэрцэ баліць, горка у горлі, плакаць—стагнаць хочэцца, ды ўжо позна, нічога, нічога не парадзіш... Канец, канец, не пасьпеў спакутывацца, прапаў жа, прапаў... Агонь! Што яшчэ за агонь, то ня сонца ўгарэло, не... І смурод, чад.

Гэ! То ж нашы канюшкі цяпло у панскім лясу разлажылі і коні пасуць. Ад паноў зямлю адабралі, бедным людзём аддалі, нікога ужо не баяцца.. І Аўтуха не баяцца... Бацька стрэльбу наводзіць, а яны ўсі на яго накінуліся, ўсім раптам сваім і каламі, каламі.. На сяле сабакі выюць, сьмерць чуюць... А бацька, крычыць: «Антон! Антон! Рат»...

(Прашнуўся. Кала яго бацька. Прыйшоў з лесу, стрэльба на плечах. Сабака хвастом віляіць і віхчыць. Антон страшэнна устрывожэны; галава яго быць нечым — сьвінцом, чым — наліта).

АУТУХ. Антон! Дабудзіцца ня можна. Лёг на сонцы і пад вецер: і галаву напячэш і прастудзішся..

АНТОН. А што—я спаў?

АУТУХ. Во пытаіцца! Спаў, але і стагнаў, хіба сніў што дурное...

АНТОН. Добра ня помню.

АУТУХ. Агоўтаішся, дык прыпомніш Уставай, зара з абедні папрыдуць... Ідзі, дай мне ўкусіць, што там ёсць сяньня...

Заходзіўся ў лесі. А сабака мяне кінуў здахата. Трэба будзе ўзяць шчанючка ў пана Будагоўскага у Дубасні.

АНТОН. А гэтага куды? (У яго гнёт на сэрцы, і ён ідзець, як не саўсім прытомны чэлавек).

АУТУХ. Знайду дарогу, здохні ён...

(Абодвы пашлі ў хату).

(Далей будзе).

ны нявязываць нямецкай культуры чужому народу».

„Germania“ (каталіцкі орган) жадае, каб і Літве было дадзено тое, што абецаліся даць Курляндзіі. Літвіны так сама жадаюць поўнай незалежнасьці, каторую здалеюць захаваць толькі прылучыўшыся да Нямеччыны. Літвіны хочуць ісьці тэйжэ дарогай, як іх суседзі, але ня хочуць пэрсональнай уніі з якім-колечы нямецкім гасударствам.

«Berl. Börsenkur.» (нацыянал-лібэральны) заяўляе, што самаазначэньне ў большэвіцкім духу с прычыны мешаніны нацыянальнасьцей і розніцы іх культурнай вышыні—немагчымо. Ядыная магчымасць — устанаўленьне граніц новых гасударств і развязка пытаньня аб будучыне іх народнымі прэдстаўніцтвамі, а не народным галасаваньнем.

Нямецкіе газэты за межамі Прусаў выступаюць проці пэрсональнай уніі Курляндзіі с Прусамі. Асабліва востра выступае проці гэтага ўсенямецкая «Leipz. Neueste Nachrichten», каторая пішэ, што гутарка можэ ісьці аб адносінах да Курляндзіі ўсяе Нямеччыны, а не адных толькі Прусаў.

Украіна.

Украінская Цэнтральная Рада.

Украінская Цэнтральнан Рада складаецца з 809 дэпутатаў, між каторымі украінцаў 624, а рэшта —прэдстаўнікі нацыянальных меншасьцей.

У Радзе ёсць і 1 прэдстаўнік беларусаў.

Між дэпутатамі—540 прэдстаўнікаў работнікаў, салдатаў і сялян, 114 прэдстаўнікаў соцыялістычных партый, 159 прэдстаўнікаў нацыянальнасьцей і грамадзкіх організацый.

ПЕЦЯРБУРГ. С Кіева наказываюць, што цэнтральная рада маніцца ўчыніць крокі дзеля прызнаньня незалежнасьці Украіны. У найбліжэйшым часе спэцыяльная дэлегація Рады выедзе да нэутральных дзержаў, каб паведаміць іх урады аб утварэньні незалежнай украінскай дзержавы.

БЭРЛІН. Паводлуг «Nordd. Allg. Ztg.», у Штокгольме ждуць прыезду украінскай дэлегаціі, каторая мае ўчыніць крокі дзеля прызнаньня Швэціей незалежнасьці Украіны.

ВЕСТКІ З РАСЕІ.

БЭРЛІН. С Штокгольму наказываюць у „Berl. Tagbl.“, што 14 марца ў Маскве адкрыўся конгрэсс рад дзеля зацьверджэньня брэсцкай мірнай умовы і развязкі пытаньня аб пераносе сталіцы ў Маскву. На конгрэссе маюць быць 3.000 дэпутатаў.

БЭРЛІН. 15.III. Як наказывае «Nationalztg», большэвіцкі з'езд у Маскве перэвагай 453 галасоў проці 30 пастанавіў зацьвярдзіць мірную умову, падпісаную ў Бярэсьці.

Пасьля гэтай пастановы прэдстаўнікі прафэсыональных саюзаў выступілі с партыі.

На становішчэ камісара дзеля заграічных спраў замест падаўшагася у адстаўку Пэдвальскага выбран Троцкій. Становішчэ гаўнакамандуючага скасовано.

ПЕЦЯРБУРГ. (Гавас). 16.III. Урадова апавешчаецца, што эвакуація Пецярбурга ўласьцямі закончэна. Адгэтуль ніхто з жыхароў места на можэ з яго выехаць. Дзеля гэтай мэты прыпынен пасажырскі рух. Рада камісараў „пецярбурскай коммуны“ (гэтак называецца цяпер урадова Пецярбург з ваколіцамі) пазволіла ізноў выпускаць буржуазные газэты, каторые былі закрыты ад часу нямецкага наступленьня. Пецярбурскае Тэлеграфнае Агенцтво перанесено ў Маскву, а ў Пецярбурзі астаўся толькі філіяльны аддзел яго.

ФРАНКФУРТ НА М. 14.III. Гадаўшчына рэволюціі 13 марца, як наказываюць са Штокгольму «Frankt. Ztg.», прайшла даволі спакойна — без спадзеваных вялікіх урачыстасьцей. У Пецярбурзі і Маскве адбываліся толькі работніцкіе сходкі.

БЕРЛІН. Як наказывае Рэўтэр с Пецярбурга, главнакамандуючый паўночным фронтам арэштаваў кн. Львова.

БЭРЛІН. Кажуць, што с падзержкай Мілюкова і Гучкова пад камандай Алексеева утварылася новая армія, каторая з Новочэркаску маніцца выступіць супроць большэвікоў.

ПЕЦЯРБУРГ. (Рэўтэр). Комэндант Владыкаўкаскага порту, генэрал Дунбудко (?), налажыў на сябе рукі.

З усяго сьвету.

БЭРЛІН. Паводлуг парыжскіх газэт, японскіе матросы занялі дом губэрскага ураду у Владывастоку.

У Токіо прыйшлі важные тэлеграмы, атрымаўшы каторые ўраз жэ сабралася рада старшых. Здаецца, што аканчацельная пастанова будзе зроблена ў панядзелак: Тымчасам у Владывасток прыйшла с Парыжа іскровая тэлеграма, паводлуг каторай Францыя выказывае сваю поўную згоду на японскае выступленьне ў Сібіры.

Згода Англіі залежыць ад становішча Амэрыкі. Але ў Амэрыцэ баяцца, шта згода на японскае выступленьне вызаве варожые адносіны Расеі.

БЭРЛІН. Паводлуг англіцкай весткі, перэдрукованай у «Leipz. N. Nachr., сэнат Злучэных Штатаў у рэзолюціі прэзыдэнту заняў становішчэ проці трывалай окупаціі Сібіру Японіей або іншай саюзнай дзержавай.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). С прычыны таго, што, спадзяючыся зацьверджэньня падпісанай мірнай умовы, вернены ўжо дыплёматычные зносіны між Нямеччынай і Фінляндзкай рэспублікай, у Бэрліне засновано фінляндзкае пасольства, каторае пачало свае чыннасьці пад кіраўніцтвам пасла д-ра Гьельта.

ФРАНКФУРТ НА М. 15.III. На швэдзкім ваенным параходзі прыехалі у Штокгольм 6 прэдстаўнікаў эстляндзкага ураду пад кірункам члена сэйму, Менінга, і члена дзержаўнай рады Мэртуа. Яна, як пішэ «Frankf. Ztg.», мае даходзіць прызнаньня эстляндзкай дзержавы.

АМСТЭРДАМ (В.Т.Б.). Паводлуг аднэй с тутэйшых газет, Паўночна-Амэрыканскіе Злучэные Штаты пажычылі дагэтуль саюзьнікам усяго 5.679.400.000 доляраў. У тым ліку: Англіі $2^1/_2$ мільярда, Франціі—1 мільярд 440 мільёнаў, Італіі 1 мільярд 550 мільёнаў, Расеі—325 мільёнаў, Бэльгіі—93.400.000, Кубе—15 мільёнаў, Сэрбіі—6 мільёнаў.

ТЭЛЕГРАМЫ.

Нямецкіе апавешчэньня:

15.III. Заходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскага: Слабая ў дзень чыннасць артылеры узмацавалася зьмерканьнем на некаторых адрэзках. Яна крапчэла ў начы с прычыны нашых і варожых разведачных атак.

Фронт нямецкага Насьледніка: Заўважэно, што на катэдры ў Рэймсе ізноў працаваў францускі пункт дзеля нагляду. Ад поўдня нашы пазыціі на поўначы і паўночным усходзі ад Прон былі абстрэліваны сільным вішчучым агнём. Сільные францускіе дружыны, наступаўшые ў вечары на шырокім фронці, толькі на заходзі ад дарогі Тюісі Боруа здалелі дайскі да нашых пярэдніх акопаў, паагул-жэ ўсюды ў бітве зблізка На ўсходнім беразі Маасу ўвёсь дзень трываў крапчэйшы агонь.

Усход.

У чысьленых бітвах разбіты варожые банды каторые гразілі чыгункам з Гомела і Кіева ў Бахмач. Бахмач занят.

16.III. Заходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскаго: У вечары і ў начы ажывілася чыннасць англіцкай артылерыі—асабліва між Арра і С. Кантэн. Ад варожага агня і кіданых бомб у ваколіцах за фронтам у Мэнін і Гальлюэн вельмі пацерпелі мейсцовые жыхары.

Фронт нямецкага Насьледніка, ф. Гальвіца і Альбрэхта Вюртэмбэрскага: На ўсходзі ад Рэймсу, наабапал Маасу і на фронці Лётарынгіі пры Вульсах і Блямон артылерыйская бітва ў дзень крапчэла. Наабапал Орн артылерыйская бітва трывала і ў начы.

17.III. Заходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскаго: У Фляндрыі ў палудні—сільны артылерыйскі агонь.

Фронт нямецкага Насьледніка і ф. Гальвіца: У розных пунктах фронту баевая чыннасць ажывілася.

Пасьля 10-гадзіннай артылерыйскай падгатоўкі францускіе сілы на шырокім фронці пачалі наступленьне на заходзі ад Авокур, але былі адкінуты агнём або штыкамі.

На усходнім беразі Маасу нашы дружыны глыбока ўварваліся на варожые пазыціі і вярнуліся назад з 200 палонных французаў, у тым ліку батальённым штабам.

У бітвах на паветры збіты 17 самалётаў і 2 прывязные лятучые шары.

КАЛЯ ВАЙНЫ.

ПЕЦЯРБУРГ (Рэўтэр). 13.III. Нямецкіе і украінскіе войскі развіваюць свае опэрацыі ў палудзеннай Расеі і занялі Чарнігаў.

Апрыч таго прыйшла вестка аб заняцьці туркамі Батумскага округа.

ЛОНДОН (Рэўтэр). 14.III. Перэважная часць чорнаморскага флота знаходзіцца у Одэссі, але усе тарговые караблі перавезены ў Севастопаль.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Імператарам загадано даць многамесячны одпуск апалчэнцам с 1867—69 гадоў.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 14.III. У часі патрульнага палёту над Паўночным морэм адно з нашых марскіх лятучых судзен пад камандай капітана лейтэнанта Дітріха ў начы с 13 на 14 марца абкідало ўдачна бомбамі порт і прамысловые будоўлі ў Гартлепуль. Ня гледзячы на адпор, момэнтамі вельмі сільны, лятучае судно не пацярпело.

Друкавана у друкарні М. Кухты. Выдавецтва «Гоман» Рэдактар Язэп Салавей.